3. *Hegel, G. W. F.* Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie: Erster Teil. / G. W. F. Hegel // Werke: in 20 Bd. / G. W. F. Hegel. – Bd. 18. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1979. – 568 S.

# ДАРОГАМІ ВАЙНЫ ДА МІРНАГА НЕБА (некаторыя псіхалагічныя і эстэтычныя аспекты ўздзеяння твораў жывапісу і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў кантэксце новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)

**А. П. Багданаў,** *выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнана мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

Сучасны чалавек лягчэй успрымае не вербальную, а візуальную інфармацыю. Таму наведванне выставак, музеяў робіцца адной з асноўных крыніц інфармацыі, актуальным сродкам выхавання. Новая экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (музей быў адкрыты 7 лістапада 1944 года, новы будынак прэзентаваны ў 2015 годзе да юбілею Перамогі) разлічана якраз на візуалізацыю фактаў, на візуалізацыю гістарычных падзей. І творы жывапісу, манументальна-дэкаратыўнага мастацтва з'яўляюцца камертонам агульнай канцэпцыі.

У беларускім выяўленчым мастацтве падзеі Другой сусветнай вайны на працягу XX стагоддзя асэнсоўваліся пароznаму. Спачатку (канец 1940-х – 1950-я) мастакі акцэнтавалі гераізм нашых воінаў, падзеі аднаўляліся ў рэалістычным ключы (напрыклад, «Мінск 3 ліпеня 1944 года» В. Волкава). У 1960–1970-я «суровы стыль» дазволіў раскрыць жахлівую праўду, увесь трагізм ваенных гадоў (дастаткова згадаць серыю жывапісных палотнаў «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага). Папярэдняя экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны была сфарміравана якраз у гэтых стылістычных рамках. Але з прыходам у мастацтва



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новага пакалення, якое вельмі ярка заявіла пра сябе на Рэспубліканскай мастацкай выстаўцы, прысвечанай гадавіне Перамогі ў 1985 годзе, падыход да асвятлення ваенных падзей змяніўся. І новая экспазіцыя 2015 года гэта выдатна ілюструе. Праўдзіва паказаныя ў музейных залах трагічныя старонкі акупацыі, ваенных падзей (дакументы, фатаграфіі, кінахроніка, інсталяцыі, дыярамы) у жывапісным паліптыху Уладзіміра Крываблоцкага «Рэквіем» (у яго аснову пакладзены дакументальныя матэрыялы і ўспаміны былых вязняў канцлагера «Азарычы») пераўтвораны ў магутныя алегарычныя вобразы, якія, з аднаго боку, узмацняюць уражанне ад экспазіцыі, але з іншага, як кожны твор мастацтва, дазваляюць перажыць катарсіс. Паліптых складаецца з пяці частак – «Анёл жалобы», «Спаленыя… ненароджаныя», «Азарычы, сакавік 1944», «Генацыд», «Рыцыр свабоды», аб'яднаных ідэяй барацьбы чорнай навалы са святлом дабрыні. Карціна народнага мастака Беларусі Уладзіміра Тоўсціка «Салют Перамогі» перадае асаблівы стан прасветленай жалобы, які перажываем мы штогод, згадваючы па вясне тых, хто аддаў сваё жыццё за мірнае неба над нашаю галавой. Гэткае ж пачуццё зафіксаванае ў вітражах Уладзіміра Даўгялы – «Салют» і вітражы ў апошняй Зале Славы. Такім чынам, максімальна візуалізаваныя ў музейнай экспазіцыі жахлівыя старонкі ваенных гадоў дзякуючы творам жывапісу і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва набываюць вобразную абалонку і скіроўваюць наведвальнікаў да пераадолення душэўнага болю.

Нягледзячы на даволі складанае архітэртурнае вырашэнне, інтэр'еры музея ўяўляюць сабою вельмі арыгінальны і даволі цэласны вобразны рад. Калі вызначыць агульнае стылістычнае вырашэнне, гэта постмадэрнізм і постпостмадэрнізм (посттрадыцыя) [1, с. 378, 383]. Каб актывізаваць увагу, неабходны быў гульнявы момант – інсталяцыі, дыярама, рэканструкцыі… У музеі ёсць і мультымедыйныя комплексы – плазменныя экраны, інсталяцыі, галаграфічныя 3D-інсталяцыі, тумановы экран, які стварае эфект полымя. У залах працуюць інфакіёскі, дзе можна «пагартаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваенныя дакументы… На шырокіх плазменных экранах – фатаграфіі, кадры кінахронікі. Можна стаць удзельнікам ваенна-гістарычных рэканструкцый – «Танкавы таран», «Пераправа на плыце артылерыйскага разліку праз раку Дняпро», «Паветраны бой».

Канцэпцыя экспазіцыі вымагала натуральнага ўключэння асобных экспанатаў, прадстаўленых на стылізаваных пад ваенны час вітрынах, у дыярамы (пейзажы, батальныя кампазіцыі і рэальна ўвасобленыя фігуры людзей). Ажыўляюць кожны з фрагментаў кадры кінахронікі, што дэманструюцца на экранах. Дыярамы не часта выкарыстоўваюцца ў сучасных музейных экспазіцыях. Аднак, выкананыя сапраўднымі прафесіяналамі жывапісныя кампазіцыі ствараюць ілюзію рэальнасці.

Аўтары экспазіцыі выкарыcталі вельмі перспектыўны на сёння кірунак – тэатралізацыю мастацкай вобразнай сістэмы. Наведвальнікі мусяць супастаўляць сябе з выкананымі ў натуральны рост фігурамі ўдзельнікаў ваенных падзей, уключацца ў тое, што адбываецца. Гэта ўзмацняе і ўздзеянне ваеннай хронікі, якая дзякуючы дыярамам і інсталяцыям не ўспрымаецца як проста экранная ілюстрацыя, а ўздзейнічае як ажыўленыя фрагменты ваенных падзей. Ад канкрэтнага экспаната (напрыклад, пілоткі салдата) да фігуры таго самага салдата, рэальнай ваеннай тэхнікі, да дыярамы, на якой знаёмы беларускі пейзаж набывае пазачасавае гучанне, і нарэшце – да рэальных дакументальных кадраў. Такім чынам творы жывапісу, мануменальна-дэкаратыўнага мастацтва, кіно не проста ілюструюць падзеі, а ствараюць атмасферу таго часу, у якую міжволі ўцягваецца чалавек, калі знаёміцца з экспазіцыяй.

Дыярама (ад грэч. «скрозь» і «від») [2] – стужкападобная выгнутая паўкружжам жывапісная карціна з пярэднім прадметным планам. Дыяраму звычайна далучаюць да масавага відовішчнага мастацтва, у якім ілюзія прысутнасці гледача ў прыроднай прасторы дасягаецца сінтэзам мастацкіх і тэхнічных сродкаў. Класікай гэтага віду мастацтва лічацца творы рускага мастака Ф. Рубо. Выкарыстанне музыкі, а цяпер яшчэ і відэа, узмацняе ўздзеянне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Плённым з’яўляецца выкарыстанне дыярамы ў музейнай справе. Дыярама «Абарона Мінска 25–28 чэрвеня 1941 года» створана маскоўскай студыяй ваенных мастакоў імя М. Б. Грэкава і ўвасабляе адну з самых драматычных старонак – баі каля Заслаўя… Практычна ўсе астатнія вітрыны, задуманыя як дыярамы, з-за таго, што іх задні фон быў створаны з дапамогай раздрукаваных фотапейзажаў, можна аднесці да інсталяцый.

Новы будынак музея разам з абеліскам «Мінск – горад-герой» складае адзіны архітэктурны комплекс. Галоўны фасад будынка выкананы ў выглядзе промняў салюта Перамогі з рэльефамі пра ваенныя падзеі. У архітэктурным плане музей складаецца з чатырох блокаў (па колькасці гадоў вайны). Блокі аб'ядноўвае экспазіцыйная галерэя «Дарога вайны». Усяго ў музеі 10 экпазіцыйных зал і зала Перамогі, якая размешчана пад шкляным купалам. Экспазіцыя будуецца паводле храналогіі – ад даваенных падзей – да аднаўлення ўсёй краіны: 1. Мір і вайна; 2. Свет напярэдадні і ў першыя гады Другой сусветнай вайны»; 3. Дарога вайны; 4. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі летам 1941 года. Смаленскі бой. Бітва пад Масквой 1941–1942 гадоў; 5. Карэнны пералом у ходзе вайны. Савецкі тыл; 6. Нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі 1941–1944 гг.; 7. Партызанскі рух і антыфашысцкая падпольная барацьба ў Беларусі. Удзел савецкіх грамадзян у еўрапейскім руху Супраціўлення 1941–1945 гг.; 8. Вызваленне Беларусі. Разгром фашысцкай Германіі, яе саюзніаў і мілітарысцкай Японіі; 9. Беларусь пасля вызвалення. 1944–1950 гг. Памяць пра вайну; 10. Нашчадкі Вялікай Перамогі.

Зала Перамогі – мемарыяльная – тут ушанаваны імёны Герояў Савецкага Саюза, пералічаны воінскія фарміраванні, якія за вызваленне Беларусі атрымалі ганаровыя найменні.

Дзякуючы вітражу і шкляному купалу Зала Перамогі набывае не жалобнае, а прасветлена-ўрачыстае гучанне. Гэта мір, тое мірнае неба, за якое загінулі героі. Пры ўсёй рэальнай перадачы тых жахлівых падзей, што адбываюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на зямлі, погляды наведвальнікаў міжволі ўзносяцца да неба – да празрыстага купала, які мусіў сімвалізаваць купал павержанага рэйхстага. Але мы бачым вельмі далікатныя вітражныя сонечныя промні, у якіх узносяцца буслы, анёлы нашай зямлі. А там, на самым версе – блакітна-сіняе неба, падобныя да белых буслоў, да анёлаў – аблокі. У музеі падчас экскурсіі гучыць шмат класічнай музыкі. Гэты лад – пераадоленне выпрабаванняў; наша памяць, жалоба і адначасова ствральнае святло робяцца лейтматывам як архітэктурнага вобліка, так і мастацка-эстэтычнай канцэпцыі музея.


*1.* Лексикон нонклассики. Художественно-эстетическая культура XX века / Под общей редакцией В. В. Бычкова. – М. : Росспэн. 2003. – 608 с.

*2.* htt:\\ru.m.wikipedia.org.


## ТЫПАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ


***І. І. Бамбешка,** старшы выкладчык*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


Палітру музейнага жыцця Беларусі цяжка ўявіць без краязнаўчых музеяў[1]. У айчынным музеязнаўстве тэрмін «краязнаўчы» ўжываецца пры разглядзе музеяў у межах іх класіфікацыі па профілі, які вызначаецца спецыялізацыяй музея, сувяззю яго з канкрэтнай навукай ці відам мастацтва, тэхнікай, вытворчасцю і яе галінамі. Сярод гэтых груп вылучаюць музеі комплекснага профілю, дзейнасць якіх звязана з некалькімі навуковымі дысцыплінамі ці напрамкамі ведаў. Самай шматлікай групай сярод іх з’яўляюцца менавіта краязнаўчыя музеі, комплекснасць якіх з’яўляецца іх характэрнай рысай. У адпаведнасці з афіцыйнай статыстыкай у структуры Міністэрства культуры Рэспублікі Бе-

[1] У артыкуле аналізуюцца толькі музеі сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.